«Вясна» — экстрэмісцкае фармаванне.
Што трэба ведаць?

Падтрымай "Вясну" на PATREON

Мінаблсуд пакінуў у сіле прысуд палітвязня Уладзіміра Няронскага. Яго этапуюць у калонію на тры гады

06.04.2021 **Тэгі**: суды, крымінальны пераслед, палітвязні

Мінскі абласны суд 6 красавіка разглядзеў апеляцыйную скаргу на прысуд палітычнага зняволенага аўтара ютуб-канала "Слуцк для жизни" Уладзіміра Няронскага. Суд Лагойскага раёна асудзіў 2 лютага па арт. 369 і ч. 1 арт. 342 Крымінальнага кодэкса блогера да трох гадоў пазбаўлення волі ў калоніі агульнага рэжыму. Гэта быў першы прысуд па «справе Ціханоўскага». Судзя Аляксандр Рыбакоў прызнаў Няронскага вінаватым у закліках у роліках "Слуцк для жизни" да дзеянняў, якія груба парушаюць грамадскі парадак у Слуцку, Мазыры, Брэсце, Бабруйску, Магілёве. Суд прызнаў, што рабіў ён гэта ў змове з блогерам Сяргеем Ціханоўскім і палітыкам Мікалаем Статкевічам. Таксама Няронскі прызнаны вінаватым у публічнай абразе ў яго роліку на ютуб-канале старшыні Слуцкага райвыканкама Андрэя Янчэўскага. На судзе блогер прызнаў віну толькі па арт. 369 КК, а па 342 — не.



Палітвязень Уладзімір Няронскі ў судзе 12 студзеня. Фота: spring96.org

Апеляцыйную скаргу Уладзіміра Няронскага разглядала судовая калегія Мінаблсуда, у якую ўваходзілі суддзі **Анатоль Дабрадзей, Бачышча, Бойка**. Уладзімір Няронскі ў разглядзе апеляцыі не ўдзельнічаў, хоць адпаведнае хадайніцтва і было заяўлена. Яго інтарэсы на судзе прадстаўляў адвакат **Антон Гашынскі**. Адвакат лічыць абвінавачванні неабгрунтаванымі, а прысуд — несправядлівым і прасіў суд адмяніць рашэнне суда Лагойскага раёна і накіраваць справу на новы разгляд. Як адзначыў Гашынскі, відэаролікі на ютуб-канале "Слуцк для жизни" былі задоўга да пратэстных падзей у краіне, таму абвінавачванне неабгрунтавана ў дастатковай форме. Па словах адваката, Няронскі на судзе і падчас следства лагічна і паслядоўна тлумачыў паслядоўнасць сваіх дзеянняў і не адмаўляў знаёмства з Сяргеем Ціханоўскім. Блогерства было яго самастойнай дзейнасцю і ніхто, у прыватнасці Ціханоўскі і Статкевіч, яго не курыраваў і не накіроўваў.

Калегія **пакінула скаргу без задавальнення, а прысуд — без зменаў**. Гэта значыць, што цягам некалькіх тыдняў Уладзімір Няронскі будзе этапаваны са следчага ізалятара Жодзіна ў калонію адбываць пакаранне тэрмінам на тры гады.

Нагадаем, пакаранне ў тры гады пазбаўлення волі запрасіў для блогера дзяржаўны абвінаваўца намеснік пракурора Лагойскага раёна **Аляксандр Ляўковіч**. У судзе ён яго падтрымаў. Праз месяц, 1 сакавіка, яго прызначылі пракурорам Валожына.



Аляксандр Ляўковіч. Фота psl.by

Опубликовать



СВАБОДА МІРНЫХ СХОДАЎ

За ўдзел у акцыі пратэсту ў 2020 годзе да "хатняй хіміі" асудзілі жыхара Мінска

За ўдзел у акцыях пратэсту ў Мінску асудзілі супрацоўніка "Беларусбанка"

Паказваў "Вікторыю" на Маршы. Мужчыну асудзілі да 2,5 гадоў "хатняй хіміі" па "народным" артыкуле

Двух сябровак асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у акцыі пратэсту ў 2020 годзе

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



"Я выйшаў з атэстацыяй «не стаўшы на шлях выпраўлення»". Аповед экс-палітвязня "Віцьбы"

"У традыцыях беларускага народу — дапамагаць людзям". Як праваабаронцы дапамагаюць рэпрэсаваным

Працягваецца ціск у зняволенні: агляд навінаў пра палітвязняў з 20 лютага па 12 сакавіка

"Не мной правілы прыдуманыя, не мне іх парушаць". Як існуюць няпісаныя правілы камунікацыі ў месцах зняволення



ГАЛОЎНАЕ

"Твой муж выйшаў — значыць ты будзеш сядзець". Былая палітзняволеная — пра жорсткія ўмовы на "хатняй хіміі"



#ВолюВясне



ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ

Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

БЧБ-сцяг на акне, вымпел з "Пагоняй", выява з Раманам Бандарэнкам: за што беларусаў судзілі ў лютым

Праваабарончая праграма "Вясна"

Кіроўцу з Баранавічаў асудзілі на 3 гады "хіміі" за рэпост публікацыі пра Лукашэнку

"Накіроўвала звароты ў Генпракуратуру і Саўмін": у Мінску за абразу Лукашэнкі асудзілі пенсіянерку

За ўдзел у акцыі пратэсту ў 2020 годзе да "хатняй хіміі" асудзілі жыхара Мінска

У Мінску пачынаецца суд над блогерам і журналістам Ігарам Карнеем

Міжнародныя НДА заклікаюць дзяржавы-ўдзельніцы Савета па

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Люты 2024

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Выбары*2024

ВЫДАННІ







ПАРТНЁРСТВА

РАДЫЯ

Kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

ВЫТОКІ

Anti-Discrimination Centre Memorial

Московская Хельсинкская Группа

СЯБРОЎСТВА

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh

european platform for democratic elections
epde













E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

